ЗАЛЕССЕ



ГРАМАДЗКА - ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА УШАЧЧЫНЫ

№ 1-2 чэрвень - ліпень 2005 г.

Может ли белорусский народ быть доволен жизнью?

Если смотреть только БТ, читать только государственные газеты, то сойдешь с ума — от неправды. Лукашенковские соловьи поют: жизнь становится лучше, жить веселее. Люди, мол, всем довольны, особенно властью.

Но, скажите, как может быть доволен гражданин, если цены на товары и продукты в магазинах растут быстрее, чем грибы после дождя? Фактически они у нас уже среднемировые! Может ли быть доволен городской житель, если квартирные платежи с 2001 года увеличились в десятки раз (электроэнергия, тепловая энергия подорожали более чем в 60 и 70 раз). И все это при мизерном и неэквивалентном росте заработной платы и пенсий.

Может ли быть довольна семья, нуждающаяся в жилье, если она потеряла в сравнении с польской семьей за годы правления Лукашенко более чем 60 тысяч долларов чистой зарплаты, или четырехкомнатную квартиру площадью 120 квадратных метров при цене 500 долларов за квадратный метр? Указанная сумма потерь — шокирующая. Но это факт! При этом следует иметь в виду, что в начале 90-х годов по валовому внутреннему продукту на душу населения Беларусь даже чуть опережала Польшу. Белорусские "челноки" хорошо помнят то время, когда поляки покупали у белорусов всякую бытовую мелочь, вплоть до сковородок и гвоздей. Однако Польша, избрав курс развития страны в цивилизованном направлении, сумела преодолеть свои трудности. Сегодня же, имея уровень средней заработной платы шестьсот долларов, Польша опережает по этому показателю Беларусь в три раза (!).

И, я уверен, если бы А.Г.Лукашенко в 1994 году избрал такой же путь развития Беларуси, то мы, белорусы, имели бы среднюю зарплату в 1995 году — 172 доллара, в 1996-м — 219, 1997-м — 266, 1998-м — 313, 1999-м — 360, 2000-м — 407 долларов, 2001-м — 454, 2002-м — 501, 2003-м — 550, в 2004 году — тоже 600 долларов, как в Польше.

При этом годовые доходы одного работающего за десять лет в сумме составили бы 46.104 доллара. Но "благодаря" А.Г.Лукашенко работающий белорус за десять лет получил в среднем зарплату в свой карман в сумме 14.820 долларов. Чистые потери отсюда каждого работающего только по заработной плате составили 31.284 доллара. Семья же из двух работающих недополучила в 1995—2004 года 62.568 долларов. В дополнение к указанной сумме потерь семейных доходов, к примеру, только за январь—март 2005 года каждая семья недо-получила заработной платы на сумму 2400 долларов.

А теперь давайте зададим вопрос средней белорусской семье несколько иначе: хочет ли она перемен, зная о приведенных сравнениях?! Хочет ли она и дальше терпеть семейные убытки от экономического курса, который проводит А.Лукашенко? А в связи с такими вопросами уточним у семьи: нужен ли и после 2006 года ей и Беларуси президент по фамилии Лукашенко?

Конечно, уровень зарплаты во многом определяет нашу жизнь. Низкий заработок — низкое благосостояние, высокая зарплата — богаче живешь. Правда, здесь еще очень много сопутствующих факторов. Скажите, могут ли быть довольны жизнью тридцать пять тысяч человек (а это, считай, средний белорусский город), если они проживают в ветхом и аварийном государственном жилье? Могут ли не хотеть перемен жители панельных домов-хрущевок, если срок их годности истек, жить в них небезопасно, но с жильцов лукашенковская система собирает отчисления на капитальный ремонт, что позволит отремонтировать дома только через 200 лет?

Из-за "колхозного" курса А.Лукашенко Беларусь потеряла за годы его правления примерно 125 миллиардов (!) долларов. Сколько квартир можно было бы построить! Вообще, получаются фантас-тические расчеты. Только за недополученную людьми зарплату, по моим прикидкам, можно было бы построить 250 миллионов квадратных метров жилья, то есть на 30 миллионов квадратных метров больше, чем имеется всего в Беларуси, включая дома сельских жителей. По потерям зарплат двух миллионов семей из двух рабо-тающих можно было выполнить 60 лукашенковских годовых объемов жилищного строительства. Если это и есть тот самый "рыночный социализм", который исповедует

працяг на 2-й стар.

Лукашенко, то это трагедия белорусского народа. Ее можно сравнить разве что с "национал-социализм-фашизмом", который нанес огромный материальный урон Беларуси в годы Великой Отечественной войны.

Отвечая телевизионным и газетным лукашенковским трубадурам, я одновременно хочу задать им такой вопрос. Скажите, господа-товарищи, а могут ли сегодня быть довольны жизнью около 200 тысяч предпринимателей? Как и жители домов ЖСК, которые составляют около 25% от жителей многоквартирных домов? Разве последние не хотят возврата на свои счета более 200 миллионов долларов, которые они отчислили на капитальный ремонт, но которые были "национализированы" в 1991—1992 годах?

А разве не хотят изменения всей жилищной политики частные собственники жилья, составляющие после приватизации уже 80% в его структуре? А это ведь есть абсолютное большинство от числа всего населения страны, которые должны узнать и частично знают, что частная собственность, в том числе частное жилье, является костью в горле для "рыночного социализма" Лукашенко.

Господа трубадуры! А может, Вы не знаете о недовольстве масс из-за навязывания им крепостных контрактов?

А может ли быть доволен жизнью руководитель предприятия, который в кошмарных снах видит наручники карательно-контрольно-налоговых органов? Разве они не хотят перемен? Разве они жаждут давать взятки и хотят быть не на свободе, а в тюрьме? А малоимущая бюджетная сфера, особенно здравоохранение? Разве те, кто работает в этой сфере, не хотят перемен?

Такой пример. К 1994 году на одного белоруса приходилось в эквиваленте 211 долларов, это если поделить тогдашнюю денежную массу на численность населения. К 2004 году этот показатель, не считая твердой валюты, составил 161 доллар. Ныне он вновь превышает двести долларов на душу населения. От таких данных плакать хочется, когда слышишь победные рапорты о росте экономики и неустанной заботе о подданных. На том же "диком" Западе с деньгами на душу населения несравнимая ситуация. Еще в 1990 году в цивилизованных странах этот показатель имел уровень 15—22 тысячи долларов. К 2004 году на душу населения уже приходилось 26—47 тысяч долларов, и разрыв между нами и ими еще больше вырос.

Белорусы бедны как церковные мыши. И при таком денежном обеспечении, причина которого в музейной форме управления страной, мы не решим ни одной социальной проблемы. Ведь еще накануне президентских выборов 2001 года Лукашенко "героически" решал задачу роста средней зарплаты до 100 долларов США, умолчав, что в 1995—1996 годах ее уровень составлял 125 долларов. Теперь он проявляет вновь свой "героизм", поднимая зарплату до 200, а то и 250 долларов. Но разве можно сравнить цены 1995—1996 годов в долларовом эквиваленте и нынешние цены? И что это за ориентиры пигмеев в 200—250 долларов? А почему не 600 долларов, как уже есть в Польше, Чехии? А почему не 1000 или 1500 долларов? А почему надо ждать чего-то от Лукашенко, а не зарабатывать самим? Вся проблема в одном — перед теми же теле- радио-газетными отработчиками поставлена задача: днем и ночью убеждать электорат, что у него есть один спаситель — Лукашенко, не было б его — и все умерли бы. Преступная пропаганда!

То, что стране нужно встать на европейский путь развития, а не идти по пути азиатского деспотизма власти или большевистского авторитаризма, очевидно для большинства белорусского народа. Люди хотят жить лучше, нежели они живут теперь, и имеют на это полное право. Стыдно и позорно, что мы, белорусы, отстаем по уровню жизни в два-три раза не только от поляков, но и от чехов, венгров, эстонцев. Ведь в начале 90-х годов стартовые условия у нас были не хуже, а лучше.

Да что и говорить, Лукашенко обманул надежды миллионов людей. При этом в грубой форме и не однажды, а много-много раз. Произошло катастрофическое расслоение общества на кучку зажравшихся и массу бедноты. Простые люди видят, как пируют те, кто у властного корыта, и их прихлебатели. Для них не существует не только никаких зако-нов, но и ничего святого. Маринича ни за что кинули за решетку, преступницу Журавкову выхажи-вают в домашних условиях. Скажите, в какой цивилизованной стране это может быть?

Независимо от того, как, каким способом Лукашенко хочет сохранить свою власть и после 2006 года, ему этого сделать не удастся. Люди не только недовольны этой жизнью, которую устроил им вождь, они хотят изменить ее. Вот мой ответ тем теле-радио-газетным лизоблюдам, которые хотели бы держать белорусский народ в темноте, подменяя правду холуйством перед тем, кто популистскими "заботами об интересах народа" только прикрывает свое истинное лицо, кто, однажды взяв власть в свои руки, не желает выпускать ее никогда. Выпустит!

Иван АНТАШКЕВИЧ, директор Фонда содействия совершенствованию общественных отношений "ЭКОН", член политсовета Объединенной гражданской партии.

(«Народная Воля» ад 2.04.2005 г.)

Падрыхтоўка да кангрэса. Працэс працягваецца

Другі этап падрыхтоўкі да кангрэса дэмакратычных сіл (альбо неяк па іншаму званага – Усебеларускага сходу прыхільнікаў перамен) пачаўся.

Нагадаем, што Віцебская абласная канферэнцыя аб'яднанай дэмакратыі адбылася 15 траўня. З прысутных 109 дэлегатаў канферэнцыі абсалютная большасць (67 чалавек) выказалі жаданне ісці на выбары на чале з Аляксандрам Мілінкевічам, беспартыйным, вылучэнцам Партыі зялёных. На сённяшні дзень А.Мілінкевіч з дзесяці суб'ектаў аб'яднанай дэмакратычнай апазіцыі (так званай "дзесяткі") заручыўся падтрымкай шасці. На кангрэсе яго згадзіліся падтрымаць у якасці "адзінага" Партыя зялёных, БНФ, БСДП (НГ), Партыя жанчын, Партыя прагрэсу і справядлівасці і маладзёжны палітычны рух "Маладая Беларусь". Апошнія чатыры палітычныя структуры аб'яднаны ў кааліцыю пад назвай "Еўрапейская кааліцыя".

У кангрэсе таксама будуць удзельнічаць у якасці паўнамоцных дэлегатаў прадстаўнікі няўрадавых арганізацый, незалежных прафсаюзаў, кандыдаты ад дэмакратычных сіл у Палату прадстаўнікоў і прадстаўнікі грамадства, абраныя на раённых сходах.

З прадстаўнікамі палітычных партый, наўрадавых арганізацый, прафсаюзаў, ды кандыдатамі ў дэпутаты усё ясна і проста. Значна складаней сітуацыя з вылучэннем дэлегатаў ад рэгіёнаў. Аўтары інструкцыі, заклаўшы норму не менш 25 удзельнікаў схода зыходзілі з простай арыфметыкі - калі ў раёне 25 тысяч жыхароў, то сярод іх знойдзецца 25 прыхільнікаў зменаў у грамадстве. Але забыліся сябры, што справа не ў тым каб знайсці гэтых прыхільнікаў, а сабраць іх у адным месцы і правесці сход па ўсіх правілах.

Тут сутыкнуліся дзве пазіцыі. Альбо зрабіць з працэсу вылучэння дэлегатаў на Кангрэс інфармацыйную і піаркампанію, рызыкуючы проста не правесці сходы і не абраць прадстаўнікоў з рэгіёнаў, таму што мясцовыя ўлады зробяць усё каб сарваць сход, альбо моцна не шумець і ва ўмовах пэўнай канспірацыі сабраць народ і вылучыць дэлегатаў.

Мы з'яўляемся прыхільнікамі другой пазіцыі. Лічым, што на гэтым этапе галоўнае не шум і карцінкі, а абранне дэлегатаў і мабілізацыя прыхільнікаў дэмакратыі, так званая рэвізія сіл.

На жаль цэнтральныя штабы нам навязваюць схему піару і таму з самага пачатку ў Віцебскай вобласці сталі зрывацца сходы. Дазнаўшыся пра маючыя адбыцца мерапрыемствы, мясцовыя службоўцы падыходзілі да арганізатараў і папярэджвалі іх аб непрыемнасцях, якія чакаюць іх альбо іхніх сваякоў.

Самае разумнае рабіць усё разумна. Там дзе магчыма шырокая абвестка і безпраблемнае правядзенне схода – інфармаваць, піарыцы абіраць. Там дзе гэта немагчыма – ставіць галоўнай мэтай абранне дэлегата.

На сённяшні дзень у розных рэжымах і варыянтах адбыліся сходы ў чатырох раёнах Віцебскай вобласці: Верхнядзвінскім, Шаркаўшчынскім, Гарадоцкім, Лёзненскім. Абранымі былі адзін сябра БСДП(НГ) і сем беспартыйных дэлегатаў.

Працэс працягваецца.

Х.Жэляпаў
Старшыня Віцебскага аддзялення ГА "Фонд імя Льва Сапегі"

Человек «ПЛЮС»

Он никогда не срывается до истерики даже при истеричной обстановке. Сначала думал, что нервы у него железные, а потом убедился, что это ему не присуще вообще. Воспитан так, более того, - это в крови.

Он не поддается наэлектризованности людей и групп, он всегда спокоен и мудр до выстраданности его седой бороды. Он умеет слушать без насилия над собой, потому что ему интересен каждый человек.

Он осторожен в высказываниях, а крайние характеристики не слетают с его уст, потому что он знает: человек многогранен.

Он мгновенен в оценках политики и экономики на английском, французском, польском и других языках. Но он всегда что-то оставляет в уголках своих глаз, и я попытался сканировать затаенную в них тайну. Получилось, но не до дна. Впрочем, он осторожно прав, он вобрал в себя настроения всего общества, он – путешественник, знающий, что надо что-то оставлять про запас, на крайний случай.

*Он – **Александр МИЛИНКЕВИЧ**, претендент в кандидаты на единого президента Беларуси.*

Интервью с ним читайте на следующих страницах нашего бюллетеня



- Александр Владимирович, давайте определимся: есть партийная оппозиция «5+», появилась даже «десятка». Вы не входите ни в одну из партий. Как Вас называть?

- «5+» - это широкая коалиция демократических сил. На старте, было, пять политических субъектов, сегодня – десять. Но главная мощь этого единения в «плюсе». Тут сотни региональных и локальных организаций, общественных и профсоюзных. Выходит, что я – человек «+». Оппозиция ли я? Конечно, только гражданская, та, в которой находится большинство населения нашей страны.

- Оппозиция чему или кому?

- Оппозиция лжи, лицемерию и, простите, хамству. Оппозиция тотальному страху и международной изоляции Беларуси.

- Не являясь членом ни одной из партий, Вы говорите «слава Богу...» или «сожалею...»?

- В организацию есть смысл вступать для самореализации. У нас политическая жизнь изуверски деформирована властью. В стране один политик с реальными полномочиями. Партийные организации – это чаще всего клубы людей с близкими политическими взглядами. Их возможности минимальны. Они не представлены в парламенте, их не видят по телевидению. Даже на местном уровне партийные активисты не влияют на принятие решений. Власть авторитарна, ей не нужна даже видимость демократии. Поэтому и не «слава Богу» и не «сожалею». Я себя реализовывал до этого не в политической борьбе, а в построении структур гражданского общества, это мне нравится и приносит удовлетворение.

- Тогда, в таком случае, согласны ли Вы с мнением Европарламента, что в Беларуси – диктатура?

- Диктатура, это тогда, когда в стране нет ни политических партий, ни СМИ, ни общественных организаций и иных структур гражданского общества. У нас они еще есть, поэтому в стране установлен авторитаризм, но все идет постепенно к тому, что скоро в Беларуси будет, полня, диктатура.

- Когда в Гомеле Вас избрали единым кандидатом от местных демсил, показалось, что единство «5+» - понятие условное. Партии ругаются, а потом шлепают себя по «партийной попе» и говорят, как дети: «Мы больше так не будем». Это же не смешно?

- Создание коалиции – дело непростое, иногда радостное, иногда – горькое. Но этому нет альтернативы. Мы обязаны объединиться и определить единого кандидата. Не у всех в этом процессе хватает самокритичности, мужества, холодного разума. Иногда эмоции берут верх. Но коалиция живет, хотя многим хотелось, чтобы она развалилась. Особенно власти.

- В Гомеле Вас выдвинула партия «зеленых» - самая человечная и перспективная. Исчезнут коммунисты и социалисты, диктатуры и парламентские республики. Мы все станем «зелеными» перед угрозой исчезновения жизни. Что «зеленые» увидели в Вас «зеленого»?

- Я не «совсем зеленый» и не член партии БНФ. Однако эти две партии поддержали мое самовыдвижение. Я глубоко признателен им за поддержку. У нас с «зелеными» было немало встреч. Они хорошо знали, что проблемы экологии мне очень близки, экологии не только природы, но и культуры. Поддержка партиями беспартийного кандидата, думаю, свидетельствует о гражданской ответственности их членов. Амбиции свои они спрятали ради широкого объединения демократических сил.

- Однако завершились региональные конференции, где Вас поддерживает много людей. Все будет решаться на

Конгрессе демократических сил. Но так ли нужен конгресс, когда его проведение почти невозможно в Беларуси? Тем более, что регионы уже проголосовали за своих кандидатов? Зачем им повторяться снова? Слово осталось еще за наиболее известными общественными деятелями, к голосу которых страна прислушивается. Так не проще бы было разослать им письма с одним вопросом: кого предпочитают видеть на президентском посту?

- Идея Конгресса с выдвижением на нем единого кандидата была достигнута ценой долгих согласований и компромиссов. Было выработано положение о процедуре, оно утверждено. Поэтому не стоит, на мой взгляд, что-то менять в середине пути, а необходимо идти с выработанными положениями уже до конца. Согласен только с тем, что Конгресс нельзя проводить за границей, и он должен состоятся как можно быстрее. Для «раскрутки» единого, без ТВ и радио, нужен как минимум год.

- А как Вы относитесь к мысли, что белорусы никогда не будут свободными, не узнав, как исчезли Гончар, Завадский, Захаренко и другие?

- Жизнь – это абсолютная ценность. Она дается Богом и принадлежит Человеку. Если мы не сообщество рабов, мы обязаны решительно требовать правды об исчезнувших политиках и журналисте.

- Являясь по природе своей человеком интеллигентным, Вы понимаете, что с такой чертой характера победить на белорусских выборах невозможно? Тут жесткость ох, какая нужна...

- Интеллигентный – это не обязательно слабовольный. Я достаточно решительный и волевой человек и всегда добивался поставленных целей. Уверен, что победить на выборах не должен демагог или популист, а человек, контрастирующий с сегодняшним президентом.

- Приобретая в прошлом году выборный опыт в Палату представителей, Вы, конечно же, поняли, что в Беларуси нельзя победить, когда урна в руках власти и прозрачна только для нее. На что Вы надеетесь?

- Справедливых, открытых и честных выборов при существующем режиме уже действительно никогда не будет. Победу надо будет защищать. Но сначала необходимо провести победную кампанию, победить в умах людей. Только тогда они выйдут вместе с нами защищать свое достоинство и будущее своих детей.

- Но все же будем реалистами, Александр Владимирович. Допустим, победите Вы в умах людей. Но потом наступит одна ночь подсчета голосов, когда все станет напрасным.

- Все уже сегодня напрасно, если не иметь веры в свои собственные силы и в справедливость борьбы со злом. Я и мои соратники свято верим в победу и перемены к лучшему.

- Как Вы относитесь к появлению на политическом горизонте такой фигуры, как Козулин?

- Я не считаю это цирком. Наоборот, хорошо, что экс-ректор первого вуза страны, такой известным человек, как Александр Козулин, имеет президентские амбиции. Отлично, что он со своими соратниками пытается привлечь новых людей к демократическим преобразованиям. Но будет непростительной ошибкой, если эти силы не вольются в общее движение.

- Вы можете коротко охарактеризовать качество оппозиции на нынешнем этапе?

- Качество сегодняшней оппозиции является наиболее высоким за последние годы. Такого широкого единения еще не было. Идет этап перехода от декларированного объединения к реальному. Это возможно только в конкретной деятельности, которую мы все вместе должны реализовать до выборов.

- На Ваш взгляд, тактика оппозиции верна в отношении единого кандидата от демсил? Может, пусть бы и шла эта четвертка или пятерка на президентские выборы?

- Идти в «растопырку» нельзя. У демсил есть общий ресурс на одну кампанию, серьезную и эффективную. Если пойдем по отдельности, все проиграем.

- Когда человек заявляет, что готов к участию в выборах президента, то делает это в двух случаях: хочет стать президентом или хочет сменить президента...

- Есть третий случай: хочу, чтобы народ Беларуси жил в цивилизованной, демократической, европейской стране. Чувствую, что я могу реализовать это.

- Так есть ли у Милинкевича вариант, как победить не власть, а режим?

- Весь режим держится на одном человека. Его уход

приведет к автоматическому разрушению сегодняшней вертикальной власти. Но это вовсе не означает, что новая власть будет автоматически демократической. За это еще надо бороться.

- На Ваш взгляд, что самое плохое в правлении Лукашенко? Имею в виду для Беларуси.

- Он полностью изменил жизнь белорусов, породил враждебность, страх в обществе и растоптал человеческое достоинство сограждан.

- Александр Владимирович, давайте отойдем от политической тематики. Какие мысли, поступки или примеры удерживают Вас на поверхности человеческой жизни?

- В первую очередь это любовь, надежда на преемственности поколений и собственная ответственности перед предками и наследниками.

- От чего теплеет и светлеет Ваш взгляд?

- Например, когда смотрю на мою двухлетнюю внучку Машеньку, которую нечасто вижу и очень люблю…

- У Вас есть любимые актер или фильм?

- Очень близок актер Иннокентий Смоктуновский. А из режиссеров Андрей Тарковский. К сожалению, ушедших из жизни.

- Какой вывод из собственной жизни Вы не устанете повторять своим внукам?

- Быть честным, порядочным и никогда не сдаваться.

- Скажите что-то теплое читателям…

- Беларусы – образованный трудолюбивый европейский народ. Мы должны жить достойно и цивилизованно.

Александр ХИЛИМОН

Формула ашуканства, або Як ствараюцца даходы камунальнікаў

Нават нязначнае прыбаўленне пенсіі падаецца дзяржаўнымі СМІ як шчодры падарунак урада, а пра тое, што адначасова павышаюцца цэны на тавары першай неабходнасці і камунальныя плацяжы, паведамляецца скупа, нібыта скрозь зубы. Але нават гэтыя някідкія паведамленні аб чарговым росце камунальных тарыфаў не даюць поўнага ўяўлення аб іх маштабах. Нам паведамляюць толькі пра відавочную, надводную частку айсберга плацяжоў. Але ж у гэтай ледзяной гары ёсць і падводная, схаваная частка — павышэнне жыллёвымі арганізацыямі разлікаў за іх паслугі насельніцтву, у выніку чаго ў нас, кватэранаймальнікаў, дадаткова адбіраюць грошы, каб за кошт гэтага камунальнікі мелі незаробленыя даходы. Як энергетык з вялікім стажам, я магу пацвердзіць свае словы фактамі.

Справядлівасць маёй думкі дакажу на прыкладзе чатырох шматпавярховых дамоў у Віцебску, якія атрымліваюць цеплавую энергію ад Цэнтральнага цеплавога пункта (ЦЦП) № 15 і знаходзяцца ў зоне адказнасці ЖЭУ-19. Я маю на ўвазе дамы №№ 10, 12 і 12 кор.1 на праспекце Будаўнікоў і дом № 5 на праспекце Перамогі. ЦЦП № 15 аснашчаны прыборам групавога ўліку цяпла. Згодна з яго паказаннямі, ЖЭУ-19 разлічваецца з энергетыкамі за ацяпленне і гарачую ваду. Сродкі бяруцца, натуральна, з жыльцоў. Але як яны бяруцца? На працягу даволі доўгага часу (з сярэдзіны 90-х гадоў мінулага стагоддзя і да 2004 года) на паказчыкі і прыборы ЦЦП ніхто не глядзеў, бо яны былі для камунальнікаў нявыгадныя. Значна выгадней было выкарыстоўваць фальшывую “норму” выдатку цяпла на падагрэў аднаго квадратнага метра жылплошчы — 0,0029 гігакалорый. Гэтая адвольная, узятая са столі ведамаснага кабінета норма прымушала спажыўцоў цяпла плаціць не толькі за ацяпленне сваіх кватэр, але і за ўцечку гігакалорый з дзіравых вонкавых цепласетак. Затое камунальнікі забяспечвалі сабе пастаянны “левы” даход за кошт налічэння пераплаты за абагрэў жылля. Такое ашуканства супярэчыла і закону, і афіцыйнай інструкцыі Мінкамунгаса, выдадзенай у 1999 годзе. Сутнасць інструкцый у тым, што, калі ЖЭУ, кіруючыся не прыборамі, а нейкімі “нарматывамі”, возьме з жыльцоў лішнія грошы, неабходна параўнаць гэтую лічбу з паказчыкам прыбора і вярнуць перабор грошай пасля пераразліку. Але за ўвесь час дзеяння міністэрскай інструкцыі (каля 5 год) ніхто, мне здаецца, пераразлікаў не рабіў, а складальнікі інструкцыі

асаблива не цікавіліся, як яна выконваецца. Зразумела, беручы з насельніцтва грошы, камунальнікі не хацелі іх вяртаць. Таму і не зважалі на інструкцыю, слушна разлічваючы, што Мінкамунгас іх за самавольства не пакарае, бо яно ідзе на карысць таму ж Мінкамунгасу. І толькі пасля шэрагу калектыўных скаргаў і майго выступлення ў мясцовым друку ЖЭУ-19 зрабіла-такі пераразлік, у выніку якога выявілася, што ўсяго за 2 месяцы 2003 года з жыльцоў залішне ўзята каля 13 мільёнаў рублёў! З пачатку 2004 года разлікі цяпла нарэшце сталі рабіцца выключна паводле паказанняў прыбора. Але гэта прыйшлося камунальнікам не даспадобы, і яны ўзяліся за пошук іншых спосабаў атрымання даходу за кошт дадатковых пабораў з недасведчанага насельніцтва. Выйсце знайшлі ў выкарыстанні новага, імі ж прыдуманага паказчыка выдатку цяпла на падагрэў "квадрата" жылплошчы. Гэты паказчык разлічваецца такім чынам: агульны выдатак цяпла на мікрараён дзеліцца на агульную жылплошчу. Атрымліваецца лічба менш за адзінку з чатырма знакамі пасля коскі. Павелічэнне любога з гэтых знакаў дае адчувальны рост платы за цяпло. Так і зрабілі нашы дарагія (у поўным сэнсе) камунальнікі з ужо знаёмага ЖЭУ-19. У лістападзе 2004 года яны разаслалі жыльцам рахункі, з якіх вынікала, што на квадратны метр жылля выдаткоўваецца 0,0234 гігакалорыі. Гэта было чыстае ашуканства! На самай справе выдаткоўвалася менш на 0,0093 гігакалорыі. Здавалася б, дробязь, няма пра што гаварыць. Але з-за гэтай дробязі аплата цяпла ў згаданых чатырох віцебскіх шматпавярхоўках узрасла больш як на 4 мільёны рублёў. Мяркую, што такім чынам ствараюцца даходы камунальнікаў не толькі ў адным мікрараёне Віцебска, але і па ўсёй шматпавярховай гарадской Беларусі. Чаго прасцей? Павялічыў адну лічбачку або нават сотую яе долю — і кладзі мільёны ў ведамасную кішэню. І рапартуй абласному і рэспубліканскаму начальству аб эканамічных дасягненнях. Няважна, што атрыманы яны ашуканствам законапаслухмяных кватэранаймальнікаў. Пераможцаў не судзяць. Але і гэта яшчэ не ўсё. Знаёмае нам ЖЭУ-19 наўмысна сказіла класічную, вядомую са школьнай фізікі формулу разліку выдатку цяпла на падагрэў вады, замяніўшы адзін паказчык формулы іншым. Атрымалася, што вада нібыта падаграецца ад нуля градусаў, у той час, як такога не можа быць, бо сярэднегадавая тэмпература вады перад яе падагрэвам — 10 градусаў па Цэльсію. Дзякуючы пераробленай, ашуканскай формуле ЖЭУ-19 павысіла выдатак цяпла на 20% і зноў абабрала даверлівых плацельшчыкаў на карысць казённага ведамства. Асобнай размовы заслугоўвае і праславуты "нарматыў" выдатку вады ў 300 літраў у суткі на кожнага жыльца — састарэлага інваліда і немаўля. Але гэтая лічба зацверджана ў сталіцы, таму не буду з ёй спрачацца. Зазначу толькі, што, паставіўшы ў сваёй кватэры лічыльнікі вады, я пераканаўся, што "нарматыў" завышаны супраць рэальнага выдатку як мінімум удвая. Вось чаму камунальнікам так не падабаецца ідэя ўсеагульнага пераходу да індывідуальнага ўліку цяпла, вады ды іншых паслуг насельніцтву. Дакладны ўлік не на карысць камунальнікам, і, хоць ён на карысць большасці грамадзян, Мінкамунгас, я ўпэўнены, будзе да апошняга супраціўляцца распаўсюджванню індывідуальных прыбораў уліку. Я пераканаўся ў гэтым, калі вырашыў дабівацца пакарання тых, хто прыдумаў і выкарыстоўваў "фармулу ашуканства" ў разліках выдаткаў цяпла. Нават не столькі пакарання, колькі прызнання сваёй віны. Куды я толькі не звяртаўся! Пісаў падмацаваныя разлікамі скаргі ў мясцовыя інстанцыі, але на іх не хацелі звяртаць увагу. У ЖЭУ-19, якое падманвала жыльцоў, мае скаргі або не прымалі, або не хацелі рэгістраваць. Мае лісты ў Мінкамунгас перасылаліся тым, на каго я скардзіўся. Сваю барацьбу за справядлівасць я пачаў у снежні 2004 года і толькі пасля чарговага, даволі рэзкага па змесце звароту ў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі праз 4 месяцы (!), у красавіку бягучага года, я атрымаў адказ ад Віцебскага гаркамунгаса аб тым, што мае прэтэнзіі абгрунтаваныя і што жыльцоў сапраўды ашуквалі. Тады ж мне вярнулі залішне ўзятыя з мяне грошы — 6,5 тысячы рублёў. Нехта пасмяецца з гэтай мізэрнай сумы: ці варта было, маўляў, марнаваць час і нервы дзеля такой дробязі? Варта, і яшчэ як! Бо цяпер не адзін я, а ўсе чытачы "Народнай волі" ведаюць, як ашукваюць тысячы людзей на карысць ведамстваў.

Раман КЛАЎСУЦЬ, пенсіянер, ветэран "Віцебскэнерга". Віцебск.

Прысвечана Васілю Быкаву...



Віцебская абласная рада ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны" і Віцебская абласная філія ГА "Фонд імя Л.Сапегі" правялі літаратурныя чытанні, прысвечаныя жыццю, творчасці і духоўнай спадчыне народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Чытанні адбыліся 19 чэрвеня, у дзень народзінаў пісьменніка ў сядзібе-музеі ў в.Бычкі Ушацкага раёна. Удзел у чытаннях прынялі сябры таварыства беларускай мовы, пісьменнікі Віцебшчыны, работнікі культуры,журналісты, родныя В.Быкава – усяго больш за 40 чалавек.

Аб яго жыццёвым шляху, творчасці і духоўнай спадчыне гаварылі старшыня абласной рады таварыства Іосіф Навумчык, галоўны спецыяліст упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Ніна Сулецкая, паэты Давід Сімановіч, Галіна Варатынская, Лера Сом, спяваў песні, прысвечаныя Васілю Быкаву паэт і спявак з Бешанковіч Георгій Станкевіч. Успамінамі аб брату падзялілася з прысутнымі сястра пісьменніка Валянціна Быкава. Госці пакінулі для музея апошні нумар альманаха "Дзвіна", каталог "Васілёва зорка", які быў выдадзены па выніках мінулагодняга пленэра мастакоў.

У кнізе наведвальнікаў музея ўдзельнікі чытанняў зрабілі запісы, запэўнілі землякоў, што будуць рабіць усё неабходнае, каб захаваць памяць аб Васілю Быкаве, пашыраць кола прыхільнікаў яго творчасці, духоўнай спадчыны; будуць змагацца за незалежную дэмакратычную Беларусь.



***Іосіф Навумчык** старшыня Віцебскай абласной рады ГА "ТБМ імя Ф.Скарыны"*

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

Дарагія людзі

Утрыманне чынавенства летась абышлося беларускім падаткаплацельшчыкам амаль у 300 мільярдаў рублёў. Менавіта такую лічбу назваў першы намеснік міністра фінансаў Беларусі Анатоль Сверж, які выступаў перад дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў.

Для параўнання: выдаткі беларускага войска летась склалі 467 мільярдаў, а на ўтрыманне праваахоўных органаў і нацыянальную бяспеку выдаткавалі 760 мільярдаў. Безумоўным лідэрам па атрыманні дзяржаўных грошай у 2004 годзе стаў аграпрамысловы комплекс. 1,7 трыльёна рублёў перададзены сюды непасрэдна і яшчэ 1 трыльён ускосна: праз зніжэнне падаткаў і адтэрміноўку іх выплаты – напрыклад, за карыстанне электраэнэргіяй, палівам і г.д.

Уладзімір Глод

"Народная Воля" (22.06.2005)

ЗААЕССЕ № 1-2 чэрвень - ліпень 2005 г.

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА УШАЧЧЫНЫ

Рэдкалегія: **Пратасевіч Мікола, Казьянін Васіль**

Наш адрас: 211480 г.п.Ушачы, зав. Заводскі-3

Надрукавана пры падтрымцы Віцебскага аддзялення «Фонда імя Л.Сапегі» Тыраж 299. Распаўсюджваецца бясплатна